# Шпрэевыя “патрыёты”

Вучняў гайнаўскага II Агульнаадукацыйнага ліцэю зь беларускай мовай навучаньня, якія ў панядзелак 2 верасьня ішлі ў сваю школу, віталі зробленыя шпрэем надпісы ля ўваходу: “*I–klasisto wybierz Polskę*”, “*Podziemie walczy*”*, аздобленыя якарам PW і рэклямным знакам “*Teraz Polska*”**.

Падобнае здараецца ўжо трэці раз у гэтым годзе. Першы раз надпісы зьявіліся ў лютым у сувязі зь візытам беларускай урадавай дэлегацыі; другі раз — у траўні. Толькі ў пятніцу скончыўся рамонт, які быў патрэбны дзеля прыбраньня травеньскіх надпісаў. Шпрэй рэагуе з атынкоўкай і зроблены ім надпіс немагчыма проста замаляваць. Трэба зьбіваць усю атынкоўку і класьці новую. Усю працу, вартасьцю 2000 зл., выканала грамадзкім чынам Бельска–Падляскае прадпрыемства — BPPB. І вось усё трэба пачынаць наноў.

Як сказаў нам дырэктар II ліцэю спадар Яўген Сачко, справа ранейшых надпісаў кіраўніцтвам школы не падавалася да публічнага ведама. На гэты раз вырашылі зрабіць яе публічна вядомай, бо баяцца, што за надпісамі пойдуць іншыя эксцэсы. Тое, што сталася, вельмі адмоўна паўплывае на дыдактычны і выхаваўчы працэсы ў школе. І гэта якраз цяпер, калі школа дасягнула высокага ўзроўню навучаньня. Паліцыя паведаміла дырэктару, што “шпрэеўцаў” вельмі цяжка злавіць, хіба што выпадкова. Усё–такі, на думку сп. Сачко, ня толькі паліцыя, але і жыхары гораду павінныя зрабіць усё магчымае, каб злавіць вандалаў, чые дзеяньні ўводзяць атмасфэру нацыянальнай нецярпімасьці ў Гайнаўцы.

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1996. 15 верасьня. № 37. С. 1, 5.

---

* “Першаклясьнік, выберы Польшчу”, “Падпольле змагаецца” (пол.). — **Рэд.**
** “Цяпер Польшча” (пол.). — **Рэд.**